*М.Л.Кузьмініч*

# МЕТОДЫКА ВЫКАРЫСТАННЯ РЭЙТЫНГАВАЙ СІСТЭМЫ АЦЭНКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Педагагічны кантроль з'яўляецца важным элементам дзейнасці выкладчыкаў ВНУ. У працэсе кантролю правяраюцца вынікі вучэбна-выхаваўчага працэсу, вызначаецца ўзровень засваення студэнтамі ведаў, уменняў і навыкаў. Кантроль скіраваны на стымуляванне іх вучэбнай дзейнасці і здзяйсняецца ў розных формах (экзамены, залікі, рубежны кантроль, акадэмічныя канцэрты, конкурсы і інш.).

Педагагічны кантроль адлюстроўваецца ў ацэнках і адзнаках (лічбавых аналагах ацэнак). У розных краінах свету выкарыстоўваюцца разнастайныя сістэмы ацэньвання якасці падрыхтоўкі спецыялістаў – ад адмовы выстаўлення ацэнак да выкарыстання шматбальных сістэм, тэстаў і г.д. Гэтыя сістэмы вельмі адрозніваюцца і звычайна адпавядаюць нацыянальным традыцыям. Пры гэтым у многіх еўрапейскіх краінах часта для кожнай ступені навучання існуе свая шкала ацэньвання.

У працэсе адукацыйных рэформаў другой паловы XX ст. у еўрапейскіх краінах акцэнт рабіўся на структурную рэарганізацыю і мадэрнізацыю зместу адукацыі, формаў і метадаў навучання і амаль не закранаў традыцыйную сістэму ацэнкі ведаў. Лічылася, што яна адлюстроўвае толькі знешні бок працэсу навучання, а яе змяненне мала што мяняе ў сістэме адукацыі.

Любое ацэньванне павінна абапірацца на прынцыпы аб'ектыўнасці, сістэматычнасці і галоснасці. Рэалізаваць іх у поўным аб'ёме часам бывае вельмі цяжка. Таму ў працэсе рэфармавання вышэйшай школы паступаюць прапановы аб стварэнні незалежных экзаменацыйных камісій, аб удаска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наленні сістэм ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў, у тым ліку аб укараненні рэйтынгавай сістэмы.

У музычным навучанні дасягненні студэнта вымяраюцца, як правіла, у канцы семестра ў час здачы залікаў ці экзаменаў. Выніковая ацэнка часцей за ўсё сведчыць аб узроўні выканальніцкага майстэрства дадзенага студэнта. Але пры гэтым не ўлічваецца выхаваўчая функцыя ацэнкі: па-за ўвагай застаюцца наведванне заняткаў, падрыхтоўка да іх, вынікі тэхнічнага заліку, акадэмканцэрта і іншых формаў рубежнага кантролю, дынаміка росту майстэрства студэнта і інш. Можа атрымацца, што пры аднолькавым выніку на экзамене студэнты на працягу семестра дэманстравалі розныя адносіны да навучальнага працэсу. Студэнт адораны, напрыклад, мог бы паказаць значна лепшыя вынікі, але не працаваў на поўную моц і за кошт свайго прыроднага таленту змог выканаць семестравыя патрабаванні. Другі студэнт, з сярэднімі здольнасцямі, дасягнуў такіх самых вынікаў, але за кошт напружанай і настойлівай працы на працягу семестра.

Сапраўды, у музычным мастацтве слухача не цікавіць, якімі намаганнямі дасягнуты пэўны вынік. І на дзяржаўных экзаменах у навучальных установах менавіта з такіх пазіцый трэба падыходзіць да выстаўлення ацэнак. Але ў вучэбна-выхаваўчым працэсе трэба максімальна выкарыстоўваць усе магчымасці ацэньвання паспяховасці, заахвочваць студэнта, забяспечваць неабходную матывацыю. Рэалізаваць гэтую задачу дапамагае, у прыватнасці, рэйтынгавая сістэма ацэнкі паспяховасці ў засваенні вучэбных курсаў.

Вопыт яе ўкаранення ў замежных і айчынных ВНУ сведчыць аб добрых выніках у вырашэнні шэрага арганізацыйных, метадычных і дыдактычных задач. Сярод іх наданне працэсу навучання стымулюючага і творчага характару, аб'ектыўна кантралюемага напрамку; павышэнне зацікаўленасці студэнта ў атрыманні адукацыі універсітэцкага тыпу; ліквідацыя суб'ектывізму, псіхалагічнага дыскамфорту, уласцівых трады-

цыйным формам навучання; спрыянне выпрацоўцы ўменняў і навыкаў самастойнай мэтанакіраванай працы студэнтаў і інш.

Выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў факультэта мастацкай творчасці мае свае асаблівасці, звязаныя са спецыфікай выкладання спецыяльных дысцыплін. У дачыненні да курса “Прафесійная (музычная) педагогіка” яна можа выглядаць наступным чынам.

Асноўнымі відамі дзейнасці студэнта ў працэсе вывучэння курса з’яўляюцца наведванне лекцый і семінараў, удзел у дыскусіях па пытаннях семінараў, выкананне заданняў для самастойнай работы і іх абарона на семінарскіх занятках (аналіз прапанаванай літаратуры, музычна-педагагічнай практыкі, падрыхтоўка анатацый, рэфератаў, дыягнастычных заданняў), тэсціраванне. Кожны з гэтых відаў дзейнасці студэнта мае пэўную ўдзельную вагу (рэйтынг) у залежнасці ад сваёй значнасці, ступені складанасці, творчасці, што выражаецца ў балах (табл.1).

*Табліца 1*

**Складнікі рэйтынгавай ацэнкі па курсу “Прафесійная (музычная) педагогіка”**

| Колькасць гадзін | | | | Складнікі рэйтынгавай ацэнкі, балы | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| лекц. | сем. | самаст. работа | усяго | наведванне лекцый | наведванне семінараў | адказы на семінарах | заданні для сам. работы | тэст (рубежны кантроль) | залік | усяго |
| 20 | 10 | 20 | 50 | 20 | 10 | 15 | 20 | 10 | 25 | 100 |

Пры выкарыстанні 100-бальнай шкалы вымярэнне рэйтынгавай сістэмы з улікам відаў вучэбнай дзейнасці будзе мець наступны выгляд (табл.2).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 2*

## Налічэнне балаў з улікам відаў вучэбнай дзейнасці

| Віды вучэбнай дзейнасці студэнтаў | Максімальны бал за | |
|---|---|---|
| | адзінку вымярэння* | увесь від вуч. дзейнасці |
| 1.Наведванне лекцый | 2 | 2х10л=20 |
| 2.Наведванне семінараў | 2 | 2х5с=10 |
| 3.Удзел у дыскусіях на семінарах | 3 | 3х5с=15 |
| 4.Выкананне задання самастойнай работы і яго абарона на семінары | 4 | 4х5с=20 |
| 5.Рубежнае тэсціраванне па выніках вывучэння курса | 10 | 10х1т=10 |
| 6.Залік па курсу | 25 | 25х1з=25 |
| | | (100) |
| *Прэміяльныя балы* | | |
| 7.Актыўны ўдзел у дыскусіях на семінарах | +2 | 2х5с=10 |
| 8.Якаснае выкананне задання для самастойнай работы | +2 | 2х5с=10 |
| 9.Падрыхтоўка рэферата з аналізам манаграфічных крыніц і выступленне перад групай (НДРС) | +10 | 10х1р=10 |
| *Памяншальныя балы* | | |
| 10. Адсутнасць на лекцыях і семінарах без уважлівых прычын | -2 | -2х15=-30 |
| 11. Нездавальняючая ацэнка за вусны адказ на семінары | -2 | -2х5=-10 |
| 12. Нездавальняючая ацэнка за пісьмовае заданне для самастойнай работы | -2 | -2х5=-10 |
| 13. Несвоечасовае (без уважлівай прычыны) выкананне пісьмовага задання для самастойнай работы | -2 за кожны пратэрмінаваны дзень | -2х?=-? |
| 14. Адмоўны вынік тэсціравання (больш за 40% няправільных адказаў на пытанні тэста) | -10 | -10х1т=-10 |

* *Заўвага.* За адзінку вымярэння прымаецца лекцыя (л), семінар (с), тэст (т), залік (з), рэферат (р).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да выніковай ацэнкі ўзроўню ведаў (да заліку) дапускаюцца студэнты, якія набралі не менш за 70% ад максімальнай колькасці балаў (г.зн. іх бягучы рэйтынг складае не менш за 70 балаў). Пры наяўнасці меншай колькасці балаў студэнт павінен выканаць усе віды заданняў, якія прадугледжаны па курсу "Прафесійная (музычная) педагогіка".

Рэйтынгавая сістэма ацэнкі выкарыстоўваецца і падчас выніковага кантролю па прафесійнай (музычнай) педагогіцы (на заліку). У залежнасці ад якасці адказу студэнт атрымлівае пэўную колькасць балаў: выдатны адказ – ад 20 да 30 балаў, добры – ад 10 да 20, здавальняючы – да 10 балаў. Калі залік праводзіцца ў форме тэсціравання, то балы выстаўляюцца прапарцыянальна колькасці правільных адказаў на пытанні тэста.

Вынікі рэйтынгу па курсу "Прафесійная (музычная) педагогіка" ўключаюць даныя бягучага і выніковага рэйтынгаў. Паказчыкі па ўсіх відах рэйтынгу выстаўляюцца ў журнал рэйтынгавай ацэнкі вучэбнай работы студэнтаў. Акрамя таго, паказчыкі выніковага рэйтынгу заносяцца выкладчыкам у ведамасць.

Праверка і ацэнка вучэбнай дзейнасці студэнтаў з выкарыстаннем рэйтынгавай сістэмы па практычным курсе, дзе асноўнай формай навучання з'яўляюцца індывідуальныя заняткі (напрыклад, заняткі на спецінструменце, дырыжыраванні і інш.), можа выглядаць наступным чынам.

У графіку вывучэння дысцыплін "Спецінструмент" і "Дырыжыраванне" на I курсе значацца 16 тыдняў па 2 гадзіны індывідуальных занняткаў, 2 рубежныя кантролі ў сярэдзіне семестра (тэхнічны залік, акадэмічны канцэрт), выніковы кантроль (экзамен).

*Табліца 3*

**Графік вывучэння дысцыпліны “Спецінструмент”**

| Тыдні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | Выніковы рубеж. кантроль – экзамен |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гадзіны | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | рубеж. кантроль – тэхн. залік | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | рубеж. кантроль – акад. канцэрт | |

Складнікі 100-бальнай рэйтынгавай ацэнкі па дысцыпліне“Спецінструмент”:

а) наведванне заняткаў – 32 балы;

б) якасць выканання дамашніх заданняў (самастойная работа) – 16 балаў;

в) першы рубежны кантроль (тэхнічны залік) – 10 балаў;

г) другі рубежны кантроль (акадэмічны канцэрт) – 12 балаў;

д) выніковы рубежны кантроль (экзамен) – 30 балаў;

Усяго – 100 балаў.

Да выніковага рубежнага кантролю (да экзамену) дапускаюцца студэнты, якія паспяхова прайшлі два рубежныя кантролі (тэхнічны залік, акадэмічны канцэрт) і набралі не менш за 50 балаў (70% максімальнай колькасці балаў).

Акрамя абавязковых балаў, студэнтам могуць налічвацца прэміяльныя і памяншальныя балы (табл.4).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 4*

## Налічэнне балаў з улікам відаў вучэбнай дзейнасці

| Віды вучэбнай дзейнасці студэнтаў | Максімальны бал за | |
|---|---|---|
| | адзінку вымярэння | увесь від вуч. дзейнасці |
| 1. Наведванне заняткаў | 2 | 2х16з=32 |
| 2. Якаснае выкананне дамашніх заданняў (самастойная работа) | 1 | 1х16з=16 |
| 3. Першы рубежны кантроль (тэхнічны залік) | 10 | 10х1=10 |
| 4. Другі рубежны кантроль (акадэмічны канцэрт) | 12 | 12х1=12 |
| 5. Выніковы рубежны кантроль (экзамен) | 30 | 30х1=30 (100) |
| ***Прэміяльныя балы*** | | |
| 6. Удзел у канцэртах | +2 | |
| 7. Удзел у міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях і конкурсах | Да 10 | |
| ***Прэміяльныя балы*** | | |
| 8. Перамогі ў фестывалях і конкурсах (лаўрэат, дыпламант) | Да 15 | 10х1р=10 |
| 9. Адсутнасць на занятках без уважлівых прычын | -2 | -2х16=-32 |
| 10. Невыкананне дамашняга задання да ўрока | -1 | -1х16=-16 |
| 11. Нездавальняючая ацэнка на рубежным кантролі (тэхнічны залік, акадэмічны экзамен), адсутнасць без уважлівых прычын | -10 | -10х2=-20 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівай размовы заслугоўвае тэхніка выстаўлення ацэнак на экзаменах, заліках і акадэмічных канцэртах па музычных дысцыплінах. Па-першае, мастацтва само па сабе цяжка паддаецца ацэнцы; па-другое, яго ўспрыманне вельмі суб'ектыўнае. Патрабуецца распрацоўка дакладнай сістэмы крытэрыяў, вызначэнне іх значнасці ў адносінах адзін да аднаго. Карысным уяўляецца прымяненне сістэмы ацэнкі выступлення студэнтаў, якая дала б магчымасць вызначыць рэйтынг кожнага з іх у межах вучэбнай групы выканаўцаў на адным з інструментаў ці нават усёй спецыялізацыі.

*Табліца 5*

**Пераклад атрыманых падчас рубежнага кантролю балаў у 10-бальную сістэму**

| 10-бальная сістэма (узроўні майстэрства) | Тэхнічны залік | Акадэмічны канцэрт | Экзамены |
|---|---|---|---|
| Выдатна 5+<br>5<br>5- | 8–10 | 9–12 | 20–30 |
| Добра 4+<br>4<br>4- | 6–8 | 6–9 | 10–20 |
| Пасрэдна 3+<br>3<br>3- | 3–6 | 3–6 | Да 10-ці |
| Недапушчальна 2<br>1 | Да 3-х | Да 3-х | – |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэхнічных заліках, акадэмічных канцэртах, экзаменах і заліках па спецыяльных дысцыплінах мэтазгодна выкарыстоўваць ацэначныя лісты (табл.6, 7, 8).

*Табліца 6*

**Ацэначны ліст (клас ансамбля)**

| Крытэрыі ацэнкі | Узроўні майстэрства ці якасці работы па кожным крытэрыі | | | |
|---|---|---|---|---|
| | выдатны | добры | пасрэдны | недапушчальны |
| 1. Узровень складанасці праграмы (твора) | | | | |
| 2. Майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора (выканальніцкае майстэрства калектыву) | | | | |
| 3. Выканальніцкае майстэрства кожнага ўдзельніка ансамбля | | | | |
| 4. Якасць інструментоўкі | | | | |
| **Усяго балаў**<br>Экзамен | 20–30 | 10–20 | Да 10 | – |
| Акадэмічны канцэрт | 9–12 | 6–9 | 3–6 | Да 3-х |
| Тэхнічны залік | 8–10 | 6–8 | 3–6 | Да 3-х |

*Табліца 7*

**Ацэначны ліст (дырыжыраванне)**

| Крытэрыі ацэнкі | Узроўні майстэрства ці якасці работы па кожным крытэрыі | | | |
|---|---|---|---|---|
| | выдатны | добры | пасрэдны | недапушчальны |
| 1. Узровень складанасці праграм | | | | |
| 2. Майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора | | | | |
| 3. Валоданне тэхнікай дырыжыравання, усімі сродкамі кіравання аркестрам | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4. Ступень эмацыянальна-валявога ўздзеяння на ўдзельнікаў аркестра | | | | |
| **Усяго балаў**<br>Экзамен | 20–30 | 10–20 | Да 10 | – |
| Акадэмічны канцэрт | 9–12 | 6–9 | 3–6 | Да 3-х |
| Тэхнічны залік | 8–10 | 6–8 | 3–6 | Да 3-х |

*Табліца 8*

**Ацэначны ліст (спецінструмент)**

| **Крытэрыі ацэнкі** | **Узроўні майстэрства ці якасці работы па кожным крытэрыі** | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **выдатны** | **добры** | **пасрэдны** | **недапушчальны** |
| 1. Узровень складанасці праграм (твора) | | | | |
| 2. Майстэрства ўвасаблення ідэйна-мастацкага вобраза твора | | | | |
| 3. Валоданне рознымі відамі выканальніцкай тэхнікі | | | | |
| 4. Артыстызм, сцэнічная культура | | | | |
| **Усяго балаў**<br>Экзамен | 20–30 | 10–20 | Да 10 | – |
| Акадэмічны канцэрт | 9–12 | 6–9 | 3–6 | Да 3-х |
| Тэхнічны залік | 8–10 | 6–8 | 3–6 | Да 3-х |

Максімальная колькасць балаў, якую студэнт можа набраць падчас рубежнага кантролю, залежыць ад віду вучэбнай дзейнасці на экзамене – 30, на акадэмічным канцэрце – 12, на тэхнічным заліку – 10. Набраныя студэнтам балы дазваляюць вызначыць яго рэйтынг у студэнцкай групе, на курсе, у класе спецінструмента (дырыжыравання і інш.).

Выніковы (семестравы) рэйтынг па спецдысцыплінах фарміруецца шляхам сумiравання балаў, набраных на працягу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

семестра (заняткі, акадэмічны экзамен, тэхнічны залік), і балаў, атрыманых на выніковым рубежным кантролі (экзамене). Максімальная колькасць балаў можа скласці 100 (з улікам прэміяльных балаў – больш за 100).

Вопыт выкарыстання рэйтынгавай сістэмы ў вышэйшых навучальных установах сведчыць аб павышэнні эфектыўнасці работы студэнтаў на працягу семестра. Гэтая сістэма стымулюе іх вучэбна-пазнавальную дзейнасць, дазваляе рэалізаваць прынцыпы аб'ектыўнасці, сістэматычнасці, галоснасці падчас ацэнкі вынікаў вучэбнай работы.

*А.І.Дубавец*

## РЭЙТЫНГАВАЯ СІСТЭМА АЦЭНКІ ВЕДАЎ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННІ

Апошнім часам усё больш студэнтаў не жадаюць быць пасіўнымі аб'ектамі выкладчыцкага ўздзеяння, а шукаюць альтэрнатывы ў навучанні. Новая грамадская роля маладога чалавека, які пастаўлены перад выбарам у палітычным жыцці, духоўным асэнсаванні навакольнага свету, патрабуе ад яго разнапланавасці і самастойнай арыентацыі ў жыццёвых каштоўнасцях.

Складаецца новая канцэпцыя характару самой адукацыі. На змену прынцыпу "вучыць" прыходзіць прынцып "вучыцца", у якім вялікую ролю адыгрывае самастойная праца студэнта.

Мэта вучэбнага працэсу заключаецца не толькі ў перадачы ведаў ад выкладчыка да студэнта, але і ва ўсебаковым развіцці ў студэнтаў здольнасці да бесперапыннай самаадукацыі, да творчага ўвасаблення ведаў на практыцы. Студэнт павінен быць актыўнай фігурай навучальнага працэсу, а не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ